# Абмяркуйма праблемы аўтэнтычнага фальклору!

26 – 28 красавіка 2019 г. у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў адбудзецца **XIII Міжнародная навуковая канферэнцыя «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання»**. Пройдуць пленарнае, секцыйныя і заключнае пасяджэнні, этнаграфічны канцэрт «Фальклор беларускай глыбінкі», майстар-класы вядучых спецыялістаў у галіне ўсходнееўрапейскага фальклору, канцэрт маладзёжных фальклорных гуртоў, экскурсія ў музей-скансэн.

Плануецца работа секцыяў па наступных напрамках: нематэрыяльная культурная спадчына і яе ахова, трансфармацыя відаў і жанраў аўтэнтычнага фальклору, семантыка і міфапаэтыка традыцыйнай абраднасці, экалогія традыцыйнай мастацкай культуры, праблемы арганалогіі і марфалогіі музычных інструментаў ды інш.

Рабочыя мовы: беларуская, руская, украінская, польская, англійская.

Да пачатку работы канферэнцыі плануецца выданне зборніка навуковых працаў «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання (памяці антраполага Зінаіды Мажэйка)».

Ахвочым прыняць удзел у канферэнцыі неабходна даслаць электронную заяўку, тэкст даклада і копію квітка аб аплаце аргузносу да 2 красавіка 2019 г. на e-mail: ethnoandfolk@gmail.com. Аргузнос складае 25 беларускіх рублёў і пералічваецца на разліковы рахунак БДУКМ: BY36AKBB36329630990055400000, ЦБУ № 527 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Мінск, вул. Варанянскага, д. 7А, БИК AKBBBY2X, УНП 100286677.

*Паводле інфармацыі арганізатараў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ